

*Да арт.* ***Прылуцкі палацава-паркавы комплекс.*** *Галоўны фасад палаца.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паркавым фасадзе і 4 шматгранныя вуглавыя вежачкі, завершаныя зубцамі, стварылі дынамічную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Гал. фасад вылучаны лоджыяй на 2 узроўнях у рызаліце з праёмамі, завершанымі спічастымі і кілепадобнымі аркамі. Рызаліт, завершаны невысокім атыкам, аздоблены складанай па форме нішай у цэнтры. Пасля 1866 да паўн. тарцовага фасада далучаны 1-павярховы аб'ём са сталовай і аранжарэяй; пазней да яго прыбудаваны 2-павярховы Г-падобны ў плане корпус; да паўд. тарцовага фасада далучаны 3-павярховы вежападобны аб'ём, завершаны нізкім шатровым дахам. У 1-й пал. 19 ст. перад гал. фасадам палаца пастаўлена 3-павярховая вежа з гадзіннікам, завершаная нізкім шатром са шпілем і флюгерам (не захавалася). Парк, адзін са старэйшых у Беларусі, мяшанага рэгулярна-пейзажнага тыпу падзелены на 2 ч. Закладзены ў канцы 17 — пач. 18 ст. на ўзор італьян. тэраснага саду; захаваліся 4 тэрасы, якія з перападамі спускаюцца да поймы р. Пціч. Пл. 4,5 га. Перад гал. фасадам палаца невял. партэр з фантанам і пейзажная частка парку, абмежаваная пад'язнымі дарогамі. У парку стаялі мураваныя капліца, свіран, былі 2 сажалкі, вадзяны млын (не захаваліся). Сярод дрэў лістоўніцы Сукачова і еўрап., арэх маньчжурскі, піхта сібірская, таполя канадскія і інш. Захаваліся адзіныя насаджэнні вярбы белай, яліны калючай, піхты аднакаляровай, топаляў белых, бяроз і інш. Цяпер у будынку палаца знаходзіцца Ін-т аховы раслін НАН Беларусі. Палацава-паркавы комплекс (палац, гасп. пабудовы, парк) унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**ПРЫМАЎКА**, слоўны выраз, які падкрэслівае якую-небудзь характэрную прыкмету з'явы без абагульненняў і вывадаў з інш. падобных сітуацый або чалавечых паводзін. Калі *прыказка* з'яўляецца закончаным меркаваннем, «замкнутым» выразам, то П. ўспрымаецца незакончанай думкай, патрабуе завершанасці кантэксту, мае абмежаваны характар. Выкарыстоўваецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб падкрэсліць пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з'явы. Прыказка можа пераходзіць у П., калі яна губляе абагульненне, адрасуецца канкрэтнаму чалавеку ў якасці яго характарыстыкі. Напр., слоўны выраз «Зяць любіць узяць» выступае як прыказка, таму што пашыраецца на ўсе аналагічныя з'явы, а «Наш зяць любіць узяць», гэта П., якая абмяжоўваецца толькі гэтай канкрэтнай з'явай. П. ўласцівы гумар і сатыра, яна блізкая да фразеалагізмаў і выслоўяў, выяўляе бліскучыя здольнасці народа да вобразнага мыслення, яго разважлівасць, назіральнасць, жыццёвы практыцызм і бясконцыя моўныя багацці. Сярод бел. П.: «На языку мядок, а на сэрцы лядок» (пра двудушнага), «Не з тваім ротам мышэй лавіць» (пра няўмеку), «Ні млеў, ні пацеў, а рот разявіў» (пра гультая), «Пальца ў рот не кладзі» (пра кемлівага). Многія П. перадаюць розныя прыкметы, парады, правілы этыкету: «Снег на куццю — грыбы на лета», «Посуд б'ецца на шчасце», «У гасцях за яду

апошні прымайся, а першы пераставай». Шматлікія П. крытыкуюць людскія заганы. Часам гэта крытыка мае з'едлівы характар, напр., пра гультайства дзяўчыны: «Але ж і стараннная! Як сваты едуць, то веніка шукае хату падмесці!». Да П. вельмі падобныя *выслоўі*.

*Літ.*: Гл. да арт. *Прыказка*.

*А.М.Аляхновіч.*

**ПРЫМА́ЦКІЯ ПЕ́СНІ**, група сацыяльна-бытавых песень. Найб. распаўсюджанне атрымалі ў 19 — пач. 20 ст. У аснове П.п. — праца і побыт прымака, яго скаргі на лёс, скупую жонку і цешчу: «Ой, не ўспеў каня адпрагчы, // Ды на лаўку сесці, // Загадала яму цешча // Свінням бульбу несці». Звычайна П.п. па сюжэце і маст. сродках простыя, таму што пісаліся пераважна самімі прымакамі: «Бадай свінні паздыхалі, а хата згарэла, // Як мне гэта прымацкае жыццё надаела!». У наш час П.п. наблізіліся да жартоўных, гумарыст.: прымакі не зняважаныя, а вясёлыя, і іх аповед аб сваім жыцці — забава для людзей.

*А.М.Аляхновіч.*

**ПРЫМЕ́ТНІК**, у беларускай мове лексіка-граматычны клас самаст. слоў, якія аб'ядноўвае словы з агульным значэннем прыметы. Па значэнні і граматычных асаблівасцях вылучаюць П. якасныя («зялёны», «цесны»), адносныя («бетонны мост», «вясковая вуліца») і прыналежныя («дзядзькаў», «леснікоў»). Якасныя П. маюць граматычную катэгорыю ступеней параўнання, якая выражае меру прыметы ў прадмета («цікавы—цікавейшы—найцікавейшы»); могуць утвараць поўную і кароткую формы («рад», «рады»); бываюць вытворныя і невытворныя («радасць — радасны», «белы»). П. змяняюцца па родах, ліках, склонах (акрамя кароткіх форм) у залежнасці ад роду, ліку, склону назоўнікаў да якіх яны дапасуюцца. У сказе выконваюць функцыю дапасаванага азначэння («Туман насоўваўся **белай** шапкай над саламянымі стрэхамі, распаўзаўся па вуліцы». М.Лынькоў); выказніка або іменнай часткі састаўнога выказніка («Зямля мая то **мяккая**, то **мулкая**, ад навальніц **прасторная** і **гулкая**, такая **непаўторная** заўсёды». П.Панчанка; «Дзень **быў ціхі, сонечны**» (Я.Брыль). У семантыка-стыліст. плане П. — адна з самых поліфункцыянальных і мабільных часцін мовы. Ён можа выражаць самыя разнастайныя па семантыцы і эмацыянальна-ацэначнай, экспрэсіўнай афарбоўцы прыметы, якасныя рысы прадметаў і з'яў.

*Т.Ф.Рослік.*

**ПРЫМЫКА́ННЕ**, у беларускай мове від сінтаксічнай сувязі, пры якой залежнае слова звязваецца з гал. толькі па сэнсе. Адносіны паміж гал. і залежнымі словамі выражаюцца інтанацыяй і парадкам слоў. Прымыкаюць, звычайна, да дзеясловаў нязменныя часціны мовы: прыслоўі, дзеепрыслоўі, інфінітывы («размаўлялі гучна», «чытаць седзячы», «просьба застацца»). Адрозніваюць П. ўласнае («размаўлялі па-сяброўску») і іменнае, калі да гал. кампанента прымыкаюць ускосныя склонавыя формы назоўнікаў, семантычна блізкія да прыслоўяў («казаць па шчырасці»).

*Т.Ф.Рослік.*

**ПРЫНАЗО́ЎНІК**, у беларускай мове службовая часціна мовы, якая ўдакладняе значэнне ўскосных склонаў і выражае адносіны паміж назоўнікамі (займеннікамі, лічэбнікамі) і інш. словамі ў словазлучэнні і сказе. Не маюць лексічнага значэння, набываюць яго толькі ў кантэксце, у спалучэнні з самаст. часцінамі мовы. Паводле паходжання падзяляюцца на невытворныя («а», «без», «над») і вытворныя («акрамя», «абапал», «скрозь»), паводле структуры — на простыя («ад», «сярод»), складаныя («з-за», «па-над») і састаўныя («згодна з», «нягледзячы на»). Удакладняючы значэнне ўскосных склонаў, могуць ужывацца з формамі аднаго або некалькіх склонаў. Адносіны паміж словамі ў сказе і словазлучэнні маюць розны характар, адпаведна і семантыка П. разнастайная: прасторавыя («лунаць над борам»), часавыя («працаваць у жніво»), аб'ектныя («зачапіцца за галіну»), азначальныя («дрэва з купчастай вершалінай»), прычынныя («крычаць ад роспачы»), мэтавыя («купіць падарунак да свята»), умоўныя («зазірнуць у слоўнік пры неабходнасці»), параўнальныя («вышынёй з паўдома») і інш.

*Т.Ф.Рослік.*

**ПРЫПЕ́ЎКА**, аднастрофная песня, якая складаецца пераважна з 4 радкоў і выконваецца часам як прыпеў да танца. П. звычайна аб'ядноўваюцца па тэмах, утвараючы сюжэтную песню. Як жанр сфарміравалася ў 2-й пал. 19 ст., у 1920-я гг. атрымала шырокае распаўсюджанне. Характэрнай асаблівасцю П. з'яўляецца незамацаванасць тэксту за пэўнай мелодыяй. У розных мясцовасцях адзін і той жа тэкст кладзецца на розныя напевы. У той час на асобныя напевы маглі спявацца дзясяткі розных тэкстаў. Выкананне П. — свайго роду спаборніцтва, слоўная імправізацыя выканаўцы, пры якой акампаніятар (гарманіст, баяніст), суправаджаючы кожную П. новым каленам найгрышаў, становіцца актыўным яе ўдзельнікам і адным з персанажаў: «Гарманіст, гарманіст, // Рубашка зялёная, // Чаму ў цябе, гарманіст, // Хата развярнёная?» П. не дае шырокай карціны перажыванняў выканаўца, у ёй заключаны нейкі адзіны момант жыцця, які падаецца не ва ўсёй шматграннасці, шматпланавасці, а эскізна, намёкамі. У той жа час П., выкананыя ў тэматычнай сукупнасці, ствараюць вобразы незвычайнай эмацыянальнай напружанасці, якія ўздзейнічаюць на слухачоў. У сучасных П. гучыць гар. лірыка, у якой знаходзяць адлюстраванне ўсе праявы сучаснага жыцця. Сёння П. — вельмі папулярны ў народзе жанр традыц. творчасці. Яна працягвае існаванне ў розных галінах маст. культуры народа, асабліва ў аматарскай дзейнасці.

*А.М.Аляхновіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ